Цана асобнага нумару 20 грош.

Opłata pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 19 — Вільня, Серада 8-га чэрвеня 1927 г. — Год I

Замах на радавага пасла у Варшаве.

7-га чэрвеня ў Варшаве на вагзале цяжка ранены радавы пасол Войков. Яго зараз перавезьлі ў бальніцу, дзе зроблена апэрацыя. Праз 55 мін. Войков памёр.

Замаховец арыштаваны. Імя яго — Барыс Кавэрда.

Кавэрда дагэтуль быў агентам д-ра Павлюкевіча і працаваў у „Беларускім Слове“ ў Вільні.

Выбух парахоуні пад Кракавам.

У 6-ці кілямэтрах ад Кракава 6-га чэрвеня здарыўся выпадак у складах бяздымнага пораху і іншых выбуховых матэрыялаў. Пацярпела многа народу, ёсьць забітыя і колькісот раненых. Страты — вялізарныя.

Прычына выбуху — паводле газэтных вестак — нязвычайная гарачыня, ад якое запаліліся некатарыя складавыя часьці выбуховых матэрыялаў.

У Кракаве і аналічных сялібах — страшэннае спусташэньне, павылятаі шыбы ў вокнах і гэтак далей.

Грозная хмара.

За апошні тыдзень на першае месца ў нашым грамадзкім жыцьці высунуліся справы замежнае палітыкі. За імі сочаць усе з вялізарным напружаньнем.

І ня дзіва: бо-ж утварылася такое палажэньне, што сусьветны мір апынуўся як-быццам на валаску. Палажэньне гэтае вельмі напамінае 1914 год—напярэдадні выбуху сусьветнае вайны. Розьніца толькі ў тым, што цяпер стварыўся канфлікт паміж іншымі сіламі, чым 13 гадоў назад.

Мы ўжо адзначалі ў адным з папярэдніх нумароў, што цяпер на дарозе да выбуху рыхтаванай буржуазіяй вайны—з мэтай зьніштажэньня новага тыпу сацыяльнае гаспадаркі ў СССР—вырастае непераможная перашкода: воля працоўных масаў у капіталістычных-жа гаспадарствах. Газэты падаюць вестку, быццам першыя заварушыліся *англійскія* работнікі, гатуючыся да абвяшчэньня *агульнае забастоўкі*. І калі Англія, разарваўшы дыпляматычныя зносіны з Радавым Саюзам, спадзявалася, што за ёй пойдуць і другія капіталістычныя дзяржавы, дык яна абмылілася: *Францыя*, якая перажывае цяжкі эканамічны крызіс у выніку сваей „бліскучай военнай перамогі“ (каштоўная гэная „перамога“!), першая заявіла афіцыяльна, што ў англійска-радавай спрэчцы яна астанецца *нэйтральнай*—ня пойдзе сьледам за Англіяй і яе не падтрымае. І гэта — беспасярэдна пасьля падарожы прэзыдэнта Францыі Думэрга з міністрам замежных спраў Брыянам у Лёндан, беспасярэдна пасьля іх урачыстых завярэньняў аб францускa-англійскай дружбе.... А сьледам за Францыяй такія-ж завярэньні зрабіла *Польшча*, пасьля—Турэччына, ня кажучы ўжо аб Нямеччыне — старой саюзьніцы СССР. А Латвія якраз пасьля разрыву Англіі з СССР падпісала даўно гатаваны торговы трактат з СССР.

Усе гэтыя праявы—нязвычайна характэрныя для сучасных палітычных адносінаў у Эўропе, ды яны паказуюць, што грозны канфлікт між найбольш магутнай капіталістычнай дзяржавай і саюзам сацыялістычных радавых рэспублік, калі і давядзе да аружнае расправы, дык усе ж ня суліць Англіі перамогі, аб якой яна лятуцела. Тым балей, што яе ўвагу адцягае ізноў ад Эўропы Кітай, ды іншыя заморскія калёніі і паўкалёніі яе.

У Кітаі, як мы і спадзяваліся, палажэньне рэзка зьмянілася. Арміі Чанг-Тсо-Ліна, які ўжо вось-вось меўся захапіць апошні пункт апоры рэвалюцыйнага ўраду ў Ханькоў, аказаліся неўспадзеўкі самі зусім разьбітымі *аб'яднанымі нанова сіламі левага і правага крыла вызваленчае партыі Куомінтангу*. І можна спадзявацца, што ў самым хуткім часе перамога паўстаўшага кітайскага народу над захватчыкамі-чужынцамі і іхнымі наймітамі спаміж „сваіх“ — будзе поўная. І тады заморскія „госьці“ або будуць прымушаны падчыніцца волі кітайскага народу і зрачыся ўсіх сваіх здабытых аружжам прывілеяў ды канцэсіяў, або — пачаць ужо фармальную вайну з усім аб'яднаным Кітаем.

Вось адна неспадзяванка для Англіі, якая лічыла справу вызваленьня Кітаю ўжо „пахаванай“. А адначасна ўзьнялася неспадзявана пагроза англійскаму панаваньню і ў пакорным дагэтуль *Эгіпце*: там гатова выбухнуць таксама аружная барацьба за вызваленьне краю спад англійскага ярма. А далей—гулкім рэхам можа адгукнуцца і вякамі ўціснаная ды рабаваная Індыя....

Усе гэтыя навіны прыпадаюць бадай на працяг аднаго толькі тыдня — беспасярэдна пасьля англійска-радавага разрыву. І хоць у СССР настроі масаў паказуюць, што народ тамака гатоў даць аружны адпор Англіі ці яе наймітам, аднак вельмі магчыма, што Англія сама будзе прымушана схаваць у кішэню свой азброены кулак, якім з такой самапэўнасьцяй пагражае СССР на Балтыцкім моры, шлючы туды — дзеля дэманстрацыі—свой магутны ваенны флёт. І зусім магчыма, што тая чорная хмара, якая так раптоўна насунулася на Эўропу, таксама раптоўна і разыйдзецца.

Ведама, калі ня здарацца другія неспадзяванкі....

ПАХОД НА ПЭКІН.

Паразуменьне Чанг-Кай-Шэка з Ханькоў.

З Пэкіна паведамляюць, што ведамы „чырвоны“ генерал Фэнг, камандзір мангольскіх арміяў, назначаны галоўным камандзірам усіх паўдзённых арміяў Куо-Мін-Тангу. Гэтая вестка яшчэ раз пацьвярджае чуткі аб злучэньні ізноў абодвух флянгаў кітайскіх нацыяналістаў і аб паразуменьні між Чанг Кай-Шэкам і Ханькоўскім урадам.

Перамога ген. Фэнга.

Ген. Фэнг абвяшчае, што яго армія ўзяла места Ханан-Фу, захапіўшы 20.000 палонных і 6 цягнікоў з амуніцыяй.

Наступленьне на Пэкін.

Ня гледзячы на алярм і ўсе спробы ратаваць палажэньне з боку Англіі і Японіі, якія кінулі навет на абарону Пэкіна свае войскі, забыўшыся аб абяцаным „нэйтралітэце“,—наступленьне на Пэкін злучаных паўдзённых арміяў—Чанг-Кай-Шэка і Фэнга — разьвіваецца надзвычайна шпаркім тэмпам.

Армія ген. Фэнга, адбіўшы спробы манджурскай арміі перайсьці Жоўтую раку, сама перайшла гэтую раку і, гонячы перад сабой армію Чанг-Тсо-Ліна, ідзе фарсаваным маршам на Пэкін. З другога боку Чанг-Кай-Шэк наступае ня менш шпарка—ўздоўж чыгуначнай лініі Нанкін-Кайфанг і Чынкіянг-Цяньдзін.

Армія Чанг-Тсо-Ліна ачысьціла ўжо тры найбагацейшыя правінцыі паўночнага Кітаю: Анвай, Хона і Кянгсу. Некалькі дывізіяў з арміі Ву-Пэй-Фу (англійскі найміт) перайшлі на бок паўдзённых правадыроў.

У Пэкіне—страшэнная паніка (трывога). Хаця армія ген. Фэнга, які, відаць, першы ўвойдзе ў Пэкін, яшчэ больш як за 500 кілям. ад Пэкіну,—сталіца ўжо падрыхтавана да эвакуацыі. Шмат чужаземных войскаў, сабраных у Пэкіне, аддачы пад каманду амэрыканскага палкоўніка.

„Камуністы ізноў падтрымліваюць Чанг-Кай-Шэка“.

Англійскія газэты пішуць, быццам камуністычны Інтэрнацыянал ізноў пагадзіўся з Чанг-Кай-Шэкам і разьвівае ў Кітаі „шалёную проціанглійскую агітацыю“. У новых інстукцыях Інтэрнацыяналу быццам загадываецца цесны кантакт кітайскіх камуністаў з правіцай кітайскіх нацыяналістаў (Куо-Мін-Танг) Чанг-Кай-Шэка — дзеля супольнай справы вызваленьня Кітаю.

Новае паразуменьне Англіі з Японіяй.

Нямецкая прэса даносіць з Шанхаю, што там перакананы ў факце новага паразуменьня між Англіяй і Японіяй—у справе супольнага выступленьня ў кітайскай справе. Быццам на падставе новай умовы — Японія выступае адкрыта проці СССР, а Кітай мае быць падзелены на дзьве паловы — „японскую“ і „англійскую“.

Паночкі—„са смакам“, няма што казаць! Толькі вось, апрача іх ёсьць і іншыя, як Амэрыка, — дый СССР яшчэ трэба Японіі „пабіць“, што таксама займе даволі часу.

Кітайская рэха—у Індыі.

У адной часопісі мы знаходзім нязвычайна цікаўнае і характэрнае пісьмо з Індыі, напісанае яшчэ ў сакавіку с. г. Падаем тут найбольш характэрныя адрыўкі з яго.

— — — — — — — — — — — —

Гаварыць пра Індыю бяз Кітаю—нельга. Гаварыць пра Кітай бяз Індыі — не дагаварваць... Абедзьве проблемы непарыўна зьвязаны: у Кітаі—падзеі, у Індыі — рэха. Рэха моцнае, гучнае, раскатнае. Нібы пярун, нібы навальніца ў гарах. Усё мацней і мацней, бліжэй і бліжэй да ўдару пяруна, да сапраўднай навальніцы. Навальніца набліжаецца.

У кожным данясеньні з месц брытанскіх індыйскіх чыноўнікаў свайму віцэ каралю, у кожным дакладзе, у кожнай тэлеграме віцэ-караля свайму брытанскаму ўрад ў Лёндан—чырвонаю ніткаю прасачваецца адна і такая-ж думка, паралізуючая мазгі, жахлівая неадвязная думка: „Навальніца набліжаецца“... Гэта спараджае перапалох: „Індыя ўзьнімаецца“...

Масы ўзьняліся. Масы рухаюцца. Вывад?—Трэба выкарыстаць гэта, павярнуць у сваю карысьць...

Чыноўніцтва на мясцох добра разумее свае задачы. Яно выканала іх. Можа бяз страху адрапартаваць па-начальству: „выканана“.

Выканана: у розных канцох Індыі распачаліся непарадкі. Але гэта ня трывожыць, ні непакоіць віцэ-караля і ўрад. Нібы па сыгналу выбухнулі непарадкі ў розных раёнах Бэнгаліі, Бамбэйскай, Цэнтральнай і інш. правінцый... Кроў цячэ рэчкаю, спакойная паліцыя і войска спакойна страляюць у бязбройны натоўп... Шмат забітых, параненых, арыштаваных...

Што гэта?... Рэвалюцыя?.. — Не, пра рэвалюцыю і гутаркі няма... Адбываецца толькі бойня між паліцыяй і бязбройным народам, які яшчэ не праціўіцца... Паліцыя страляе ў мусульманаў „намераных наскочыць“ на індусаў, паліцыя страляе ў індусаў, „якія рыхтуюцца ўчыніць наскок“ на мусульманаў... Тым і другім тлумачыцца: „Твае ворагі нападаюць, абараняйся. Мы ахоўваем вас“:

Па ўсёй Індыі ляцяць тэлеграмы, падрабязьнасьці бойняў. З Індыі яны распаўсюджваюцца далей, па ўсім сьвеце. „Індыя хвалюецца, Індыя—у агні міжрэлігійных непаразуменьняў“. І ў той час, калі мусульмане і індусы яднаюцца, ствараюць адзіную нацыю, адзіны фронт,—разьдзьмухваньне няіснуючай варожасьці сапраўды ўплывае на найбольш адсталыя цёмныя масы і спараджае гэтую варожасьць, якая ўважліва культывуецца агентамі брытанскага ўраду. Лідэры народныя трацяць усе свае сілы, усю энэргію, каб загасіць варожасьць, ня даць ёй выявіцца...

Выканана: войска пасылаецца ў Кітай... Індыя хвалюецца, пратэстуе, гукае... Пратэсты заглушаюцца залпамі „ўцішаючага“ рэлігійныя страсьці войска. Заглушаюцца залпамі па забастоўшчыках, стогнамі паміраючых ад голаду раёнаў, скаргаю катаваных і закатаваных у сярэдня-вяковых засьценках Мандалайскага, Інсэйнскага і іншых вастрогаў...

Па Індыі праносіцца хваля забастовак... Выкліканы абурэньнем, нездаволеньнем, пратэстам... Забастоўшчыкаў „уціхамірвае“ войска, дабрахвотнікі з ангельцаў, паліцыя... Залпы, забітыя, параненыя, арыштаваныя... Зьніжэньне і без таго мізэрнага заработку, масавыя звальненьні, „чорныя сьпісы“... Усе чароўнасьці разгулу трацячай галаву рэакцыі.

Войска пасылаецца. Пратэсты павялічваюцца, робяцца больш вострымі.

Адказ?- Вёска Панабалія: некалькі дзесяткаў забітых, сотні параненых, тысяча арыштаваных. Панабалія—„рэлігійныя спрэчкі“, — правакацыя паліцыі, якая накіравала дзьве рэлігійныя працэсіі адна проці аднэй і распачала страляніну па бязбройным натоўпу... Калькута, Бамбэй і г. д. — усюды амаль такое-ж паўтарэньне. Гэта быў адказ ураду на магутны, захапіўшы ўсю Індыю пратэст.

Усе лідэры індыйскага народу, пачынаючы ад самых умераных, навет кансэрватыўных, і канчаючы самымі левымі, аднадушна пратэстуюць і проці гэтых правакацый і проці пасылкі індыйскага войска ў Кітай. Сам „вялікі“ Гандзі, які захапіў пасьля Нацыянальнага Кангрэсу, што быў у сьнежні, манаполію кіраўніцтва індыйскім нацыянальным рухам і які імкнецца весьці гэты рух па згодніцкім шляху, навет ён прымушан быў выказацца досыць востра проці пасылкі войска, проці правакацыі.

Але войска пасылаецца... Праўда, брытанскі ўрад здалеў паставіць індыйскую армію „па-за ўплывам“ нацыянальнага руху...

У індыйскае нацыянальнае сабраньне— нешта далёка напамінаючае буржуазна-эўрапэйскія парляманты, падаецца пытаньне аб вайсковым бюджэце Індыі. Справа нацыянальнага сабраньня тут вельмі маленькая: толькі зацьвердзіць. І не спрачацца. Так рабіла і зробіць нацыянальнае сабраньне. Гэта ведае віцэ кароль і едзе ў Банал, далёка ад Новага Дэлі, дзе засядае парлямант.

Два дні абмяркоўвае пытаньне няшчасная гаварыльня... Галоўнакамандуючы абураны... Як адважыліся?., Што?.. Крытыкуюць?..

І яны сапраўды шпарка выявіліся, гэ-

Да ведама выбаршчыкаў м. Вільні.

З прычыны ўнутраных спрэчак паміж партыямі, якія ўтварылі Аб'яднаны Выбарны Камітэт Сацыялістычных Партыяў і Прафэсіянальных Саюзаў,—камітэт гэты *зьліквідаваўся*.

У сувязі з гэтым Беларускі Выбарны Камітэт увайшоў у паразуменьне з *новаўтвораным Аб'яднаным Работніцкім Камітэтам* Незалежнае Сацыялістычнае Партыі Працы, ППС—лявіцы і Прафэсіянальных Саюзаў, які ў сваім сьпіску зьмяшчае і беларускіх кандыдатаў на радных места Вільні на такіх мясцох, што забясьпечваюць выбар.

Усе работнікі-беларусы, уся беларуская працоўная інтэлігенцыя павінны, як адзін чалавек, *згуртавацца пад сваім беларускім сьцягам* і на выбарах ісьці рука ў руку з *Работніцкім Камітэтам*. Толькі на гэтым шляху нас чакае перамога!

тыя вынікі: „Індыйскае нацыянальнае сабраньне пасьля двух дзён спрэчак па пытаньню аб вайсковым бюджэце адхіліла патрабаваньні вайсковага дэпартаманту і большасьцю 56-ці галасоў зусім адмовіліся зацьвярдзіць вайсковы бюджэт Індыі“. Крыху інакшых вынікаў чакаў віцэ-кароль...

Але што азначае гэта дэманстрацыя? Чаму раптам нацыянальнае сабраньне набралася такой адвагі? Чаму пачуўся сьмех, калі паважаны сэр Бэрдвуд, галоўнакамандуючы ўсімі брытанскімі сіламі Індыі (і Сярэдняга Усходу) з пенаю ў роце абараняў сваю пазіцыю? Чаму так востра дзёрзка пасыпаліся абвінавачаньні з парляманцкай трыбуны, да гэтага часу паслухмянай і ціхай? Гэта толькі вынік апошняга прыстасаваньня старых, „пасьвечаных традыцыямі“ мэтадаў брытанскай палітыкі... Адказ на адказ ураду, на правакацыі, бойні, расстрэлы, забойствы, арышты, засьценкі і г. д.

Рэальных вынікаў ад гэтай адмовы ўраду, гэтай дэманстрацыі, чакаць, зразумела, не даводзіцца: віцэ-кароль сваёю ўладаю поўнасьцю зацьвердзіць вайсковы бюджэт. Але нацыянальнае сабраньне ўзяло значны курс улева, **каб абмыць рукі, каб ня быць удзельнікам у грубых беззаконных і недапушчальных актах вайсковай палітыкі ўраду**, — піша ў сваёй перадавіцы 17-га сакавіка „Форуорд“, орган левых свараджыстаў.

330 мільёнаў Індыі ўважліва сочаць за барацьбою 440 мільённага Кітаю процi брытанскага імпэрыялізму. Кожны сход гучным раскатным рэхам адбіваецца ў Індыі. У Кітаі — падзеі, у Індыі — рэха. Рэха гучнае, перакатнае. Як пярун, як навальніца ў гарах. Усё мацней, бліжэй і бліжэй да ўдару перуна, да сапраўднай навальніцы... Навальніца набліжаецца...

Навальніца будзе.

Перад ёю ня стрывае тая старэнькая хатка, што завецца Брытанскай Імпэрыяй.

— — — — — — — — — — —

Ціж дзіўна пасьля гэтага тая страшэнная варожасьць кансэрватыўнага ўраду Англіі — да СССР, на які ўскладаецца адказнасьць за прабуджэньне і Кітаю і Індыі?!

ВОДГУКІ АНГЛІЙСКА-РАДАВАГА РАЗРЫВУ.

Ад'езд радавай дэлегацыі з Лёндану.

3-га чэрвеня радавая дэлегацыя ў лічбе 75 асобаў выехала з Лёндану ў Бэрлін. На вагзале сяброў дэлегацыі праводзілі сябры англійскай работніцкай партыі, якія ахвяравалі старшыні дэлегацыі некалькі букетаў чырвоных красак.

Справа разрыву ў англійскай Палаце Лёрдаў.

Англійскія Лёрды аказаліся больш дальнавіднымі, як паслы парляманту. Бо ж знайшлася вельмі значная частка аратараў, якія перасьцерагалі ўрад перад небясьпекай ад разрыву. Але урад змабілізаваў сваіх найлепшых прамоўцаў, каб пераканаць палату ў патрэбе разрыву. Яны даводзілі, што ня толькі разрыў ня выклікаў і ня выкліча ніякіх згубных выпадкаў у міжнародавай палітыцы, але наадварот, разрыў быццам страшэнна падняў „прэсьціж“ Англіі ў сьвеце.

Радава-турэцка-афганскі блёк.

Чычэрын у бытнасьць сваю ў Парыжу адбыў нараду з тамтэйшым турэцкім паслом. Кажуць, быццам СССР — у адказ на разрыў з Англіяй—рыхтуе проціанглійскі саюз СССР, Турэччыны і Афганістану.

Прыезд Чычэрына ў Бэрлін.

Нямецкія газэты пішуць, быццам у Бэрліне на 8 чэрвеня спадзяюцца прыезду Чычэрына, які перад сэсіяй Рады Лігі Народаў мае адбыць нараду з Штрэзэманам.

СССР прапануе Польшчы гаранцыйны трактат.

Радавыя газэты пішуць, што радавы ўрад мае ўзнавіць прапазіцыю польскаму ўраду заключыць гаранцыйны трактат. Вялікае значэньне ў гэтай справе мае быццам падарожа пасла Войкава ў Маскву. Быццам радавы ўрад ня будзе трэбаваць якіх-небудзь зьменаў у Трактаце 1921 г. (Рыжскім), апрача толькі пункту аб фінансавых абязацельствах, якія радавы ўрад запрапануе зьменшыць.

Запярэчаньне нямецкага ўраду.

Нямецкая афіцыёзная („паў-урадавая“) прэса пярэчыць весткам, быццам англійскі ўрад робіць націск на нямецкі ўрад — у сувязі з разрывам зносінаў з СССР. Урадавыя кругі Нямеччыны быццам навет і не спадзяюцца гэткіх крокаў з англійскага боку.

Цікаўна параўнаваць з гэтым „запярэчаньнем“ тое, што піша ў газ. „Бэрлінэр Тагебляд“ адзін з найлепшых нямецкіх журналістаў. „Ужо некалькі месяцаў, як можна сцьвярдзіць моцны націск англійскай палітыкі на Нямеччыну. Немцы рысуюцца англійскай прапагандай, як пратэктары сусьветнай рэвалюцыі, і гэткім спосабам нас хочуць скрышыць ды зьбіць з нашага становішча. Але лінія нямецкай палітыкі — ясная і непахільная.

Павялічэньне каманднага складу радавага флёту.

Пастановай Ваенна-Рэвалюцыйнай Рады 27-га траўня прызваны на чынную службу 3 гады спэцыялістаў з запасу ваеннага флёту. Набіраюцца асабліва каманды для новых падводных лодак Балтыцкага, Чорнаморскага і Ціха-акіянскага флётаў.

Радавая прэса аб Англіі.

Радавая прэса перапоўнена артыкуламі ды заметкамі аб Англіі. Чарговы артыкул „Праўды“ піша аб „лёрдах падпалячах“, аб „сусьветных жандарох“ і „сусьветных шпіёнах“, называючы так англійскі ўрад. „СССР не баіцца імпэрыялістычнай Англіі дый добра спаткае кожную спробу справакаванага Англіяй нападу на яго. Урад СССР—наймацнейшы ў сьвеце, бо за яго стаяць усе працоўныя масы СССР і сымпатыі ўсіх уціскаваных працоўных на сьвеце. Ці можа тое-ж сказаць аб сабе бандыцкі ўрад лёрдаў, урад багатыроў, фальсыфікатараў, турэмшчыкаў-катаў Індыі, Эгіпту, Паўдзённай Афрыкі катаў кітайскай равалюцыі і душыцеляў работніцкіх вольнасьцяў“?

Англія хоча ўзнавіць гандаль з СССР?

Міністар унутраных спраў сказаў у англійскім парляманьце, што англійскі ўрад ня зьбіраецца рабіць якія колечы перашкоды радаваму гандлю з Англіяй. Радавыя грамадзяне, якія будуць прыяжджаць у Англію з таргавымі мэтамі, будуць сустракаць такія ж адносіны да сябе, як і грамадзяне ўсіх іншых краёў.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Сэсія Сойму—20 чэрвеня.

1 траўня адбылася нарада старш. Сойму з марш. Пілсудскім—ў справе склікаcivья Сойму на надзвычайную сэсію. Вярнуўшыся з Бэльвэдэру, дзе жыве марш. Пілсудскі, старш. Сойму заявіў журналістам, што першае паседжаньне гэтай сэсіі пачнецца 20 чэрвеня. Старшыня Сойму паведаміў прэм'ера аб тэй праграме працы, якую злажыла апошняя нарада польскіх („апазыцыйных“) клюбаў (у адсутнасьці 2 „клюбочкаў“ урадавых). Але прэм'ер адказаў, што ў справе праграмы сэсіі мае зрабіць з старшынёй Сойму яшчэ спэцыяльную нараду, тэрмін якой яшчэ ня вызначаны.

Запярэчаньне міністра Залескага.

Польскае міністэрства замежных спраў афіцыяльна запярэчвае весткам нямецкай прэсы, быццам паслы вялікіх дзяржаў зрабілі супольную візыту мін. Залескаму, каб націснуць польскі ўрад да паразуменьня з Нямеччынай.

Заграніцай.

Пасол Хлаповскі націскае на Брыяна.

3-га чэрвеня польскі пасол Хлаповскі зрабіў візыту Брыяну — у справе „неспаўненьня нямецкім урадам абяцанага збурэньня крэпасьцяў на ўсходніх граніцах“.

Зьмяншэньне акупацыйных войскаў.

Новая перамога Нямеччыны: францускія акупацыйныя войскі пакінуць у палове чэрвеня раён Саары.

Крывавыя падзеі ў Афінах.

У сталіцы Грэцыі, Афінах, камуністы з'арганізавалі вулічную дэманстрацыю. Процi іх была паслана кавалерыя, якая заатакавала дэманстрантаў, разганяючы іх. Тады дэманстранты пачалі рабіць барыкады і абкідаць войска каменьнямі. Тады паклікана была жандармэрыя, якая штурмавала барыкады і здабыла іх, ды пры гэтым заарыштавала многа людзей. Быццам камуністычныя паслы йшлі на дэманстрацыі ў першых радох.

Новы канфлікт між Югаславіяй і Альбаніяй.

Італьянскі ўрад ізноў амаль не справакаваў вайны між Югаславіяй і Альбаніяй (чытай: Англія)! Прычапіўшыся да нейкіх дывэрсыйных разрухаў на альбанска-югаслаўскай граніцы, англійскі ўрад, ведама-ж, падбураны сваімі італьянскімі дарадцамі, арыштаваў югаслаўскага консула ў Тыране Г'юрковіча — за яго быццам „шпіёнскую дзеяльнасьць у Альбаніі... Югаслаўскі ўрад страшэнна абурыўся за гэтае пагвалчэньне міжнародавых звычаяў, прыклад якога падае ўсяму сьвету — „найкультурнейшая Англія“. Югаслаўскі прадстаўнік у Альбаніі вельмі рэзка патрэбаваў безадкладнага звальненьня консула Г'юрковіча, пагражаючы вострымі рэпрэсіямі процi альбанскага ўраду. Справа можа б і скончылася чымсь больш паважным, як гэтага хацеў Мусоліні, але апошняе паразуменьне—Англіі з Францыяй ізноў неяк наладзіла мір на Балканах. Альбанскі ўрад выразіў згоду на звальненьне Г'юрковіча — пад варункам, што югаслаўскі пасол у Альбаніі... возьме назад некатарыя рэзкія словы з сваей вострай заявы пратэсту... Пэўна-ж возьме: цана даволі танная.

Урадавы крызіс у Румыніі.

Румынскі прэм'ер ген. Авэрэску—па думцы караля аб стварэньні „шырокай коаліцыі“—пасьля доўгага апору нарэшце падаўся ў адстаўку разам з усім габінэтам. Сам ген. Авэрэску аднак-жа ня здолеў стварыць новага ўраду — на падставе шырокай парляманцкай коаліцыі партыяў: павадыры ўсіх буйнейшых клюбаў Сойму адмовіліся ўвайсьці ў габінэт генарала. Тады г. Авэрэску—ад імя караля даручыў стварэньне новага ўраду павадыру... румынскіх эндэкаў, праф. Іорга. Вось як будзе выглядаць — „шырокая падстава“ новага ўраду ў Румыніі. На тое ж яна і—Румынія...

Пастановы Галоўнай Рады П.П.С.

30 траўня адбыўся сход Галоўнай Рады ППС, якая прыняла рад характэрных пастановаў. З іх партыя зрабіла і агульна-палітычны вывад: перайшла ў „апазіцыю без засьцярогаў“.—„Якая гэта будзе „апазіцыя“, ды „барацьба“, якую ўжо пэпээсы, як пішуць самі, адкладаюць... да часу выбараў у Сойм,—пабачым у свой час. А цяпер дамо пэўнае паняцьце аб пастановах Рады.

Палітычная рэзалюцыя Рады страшэнна выхваляе ролю ППС „пасьля перавароту—сярод таго „замэнту ідэовэго“, які запанаваў пасьля перавароту“. „ППС энэргічна бараніла... работніцкую клясу, яе жыцьцёвыя патрэбы і правы, а таксама—запраўдна-дэмакратычныя падставы дзяржавы“... „Бараніла“... Ну, добра, але—ад каго?—Дык вось — якраз ад тых новых валадароў Польшчы, якія прыйшлі ў выніку перавароту... Але вось—у-ва ўсіх папярэдніх сваіх „ухвалах“ за апошні год ППС асабліва хвалілася тэй сваей роляй—у часе перавароту, роляй, якая рашуча запэўняла яму перамогу...

Рэзалюцыя вельмі гумарыстычна хваліцца тым, што ППС „умацавала сваё становішча ў краі і ў грамадзянстве, як важны і цалком самастойны палітычны і сацыяльны чыньнік“... „Зусім самастойны“, — гэта значыць чыньнік, перадусім незалежны ад ураду... Трэба было тут-жа дадаць толькі: сколькі „таварышоў-пэпээсаў“ незалежна і самастойна... атрымліваюць пэнсію ад ураду, як міністры, віцэ міністры, дырэктары дэпартамэнтаў, старшыні ды сябры розных „камісіяў“, камітэтаў, сэкцыяў, як дэлегаты на канфэрэнцыі і т. д. і т. д.?! Можа-б сьпісак гэты і зьмясьціўся побач з рэзалюцыяй—на першай старонцы „Работніка“..

Рада ППС „сцьвярджае, што гаспадарчая і палітычная дзеяльнасьць ураду (марш. Пілсудскага) абслугуе перадусім інтарэсы і імкненьні валадаючых клясаў“.—Дзеля іх — пазбаўляюцца дапамогаў безработныя, дзеля іх дазваляецца вываз збожжа з краю, дзеля іх дапускаецца ўзрост дарагоўлі ў краі; дзеля інтарэсаў вялікага капіталу ўрадавыя „палюбоўныя суды“ вырашаюць споркі яго з Працай; дзеля іх нарушаюцца прызнаныя законам правы пралетарыяту. Дзеля інтарэсаў валадаючых клясаў, а перадусім нячуваных памагутнеўшых абшарнікаў, „сабатуецца зямельная рэформа, тасуюцца палітычныя рэпрэсіі“...

І вось,—першы раз за ўвесь „памаёвы год“!—паны пэпээсы ускладаюць віну і адказнасьць за гэтую „палітыку, ствараючую ўсё больш цяжкае гаспадарчае і палітычнае палажэньне працоўных места і вёскі — на

Новы прэсавы дэкрэт.

7 чэрвеня ўваходзе ў законную сілу новы дэкрэт п. Прэзыдэнта Рэспублікі, які часова—да выданьня новага закону — рэгулюе жыцьцё прэсы ў Польшчы. Праўда, гэты дэкрэт павінен яшчэ знайсьці аканчальную санкцыю ў Сойме, але, як чутно з правых газэтаў, большасьць Сойму ўжо цяпер не адкіне згары і цалком гэтага дэкрэту, як зрабіла гэта з яго першым выданьнем, і — наадварот—прыме ды зацьвердзіць яго, зрабіўшы ў ім толькі дробныя папраўкі. Падаем зьмест дэкрэту паводле газэт „Kur. Wil.“ і „Kur. Warsz.“ (№№ 147 і 148).

Перадусім, новы твор польскага ўраду—вялізарны, даўжэнны: дэкрэт мае аж 109 артыкулаў. Ужо гэта не варожыць згары нічога дабрага прэсе і яе вольнасьці, якую „гарантуе“ арт. 105 Канстытуцыі. Бо ў іншых, запраўды дэмакратычных краях прэсавыя законы складаюцца ўсяго з некалькіх артыкулаў, а англійскі закон, здаецца,—толькі з двух, з якіх першы сцьвярджае свабоду прэсы, а другі кажа, што за надужыцьці яе вінаватых карае суд прысяжных...

Увесь дэкрэт складаецца з 4 часьцей, якія разам маюць 12 аддзелаў. На першым месцы стаіць артыкул, які, як быццам пазываючыся на Канстытуцыю, кажа: прэса ў Польшчы вольная. Далей ідуць „навуковыя азначэньні“, што такое „прэса“, што такое—часопісь... быццам у падручніку для вучняў ніжэйшых клясаў! Усялякія друкі можна распаўсюджываць зараз-жа пасьля таго, як адміністрацыйнай уладзе будуць дастаўлены тры экзэмпляры гэтых друкаў. Апрача таго—і гэта ўжо нешта новае!—адзін экзэмпляр друку, калі ён ня большы за 3 друкаваныя аркушы, павінен быць пераслалы пану пракурору Акружн. Суда — ў яго бібліатэку... Далей дэкрэт дае адміністрацыі права забараняць распаўсюджываньне ўжо законна выданых дый не сканфіскаваных друкаў, ці наагул— „іх пэўны род“ — „з пагляду на публічную бясьпечнасьць ці на публічную маральнасьць“ — у тых ці іншых мейсцах, напр каля касьцёлаў, школаў, казармаў, ці—памяшчэньня, дзе адбываюцца выбары... На пэўнай адлежнасьці прадажа гэткіх „небясьпечных ды немаральных“ друкаў ужо ня будзе пагражаць ані вонкаваму, ані ўнутранаму ладу грамадзянства...

Зусім незразумелыя абмежаваньні стаўляе дэкрэт для бедных хлапцоў-газэтчыкаў. Перадусім, газэтчыкі ня могуць мець менш, як 17 гадоў (чаму не 16, або — 18?!). Гэта часам папросту засуджае на голад цэлыя сем'і, якія часта кормяцца працай маладых хлапцоў-газэтчыкаў. Апрача таго, газэтчык цяпер ня мае права рэклямаваць газэтаў, выкрыківаць тыя, часта сэнсацыйны весткі, якія прыносяць тэлеграмы ў газэтах, як гэта робіцца на ўсім жывым, цікавячымся жыцьцём, сьвеце. Польскі газэтчык будзе мець права толькі выкрыківаць назоў газэты, а больш абсалютна нічога...

На кожным друку павінна быць надрукаваны прозьвішча адказнага рэдактара, які адказывае, як асабіста, так сама і кішанёй. Рэдактарам—гэта так сама навасьць — можа быць толькі грамадзянін Польшчы. — Чаму, напрыклад, ня мяе права рэдагаваць у Польшчы эмігрантцкую газэту эмігрант прыязнай да Польшчы дзяржавы, якога яшчэ лягчэй „трымаць у руках“ адміністрацыі, зразумець цяжка... Але спэцыяльна вышэйшага веку для рэдактара, як агульнае паўналецьце, дэкрэт слушна не вымагае. Рэдактар павінен мець паўнату грамадзянскіх і палітычных правоў. Паслы і сэнатары ня могуць быць адказнымі рэдактарамі часопісяў.

Важным абмяжаваньнем зьяўляецца забарона выдаваньня нанова зачыненай часопісі—ў новым, але падобным да даўнейшага відзе... Рэдакцыя гэтага артыкулу, наагул небясьпечнага, можа выклікаць сталыя надужыцьці з боку адміністрацыі.

Рэдактар абязаны друкаваць усе „запярэчаньні ды абвесткі“, прысланыя дзяржаўнай установай. Першыя — бясплатна і ў бліжэйшым нумары, другія — „за звычайную плату“ (?).

II частка дэкрэту кажа аб „праступленьнях прэсы“.

Гэта, зразумела, галоўная частка дэкрэту. Тутака ляжыць яго „душа“, мэтай якой зьяўляецца — застрашэньне прэсы. Што гэта — так, відаць з першых жа слоў гэтай часткі.

Дэкрэт першым чынам павялічывае кару за праступленьні прэсы. Калі прыняць пад увагу, што дэмакратычная рэспубліканская Польшча дагэтуль зьберагае, як цэнную спадчыну, найлепшыя „пэрлы“ паліцэйскага заканадаўства ўсіх трох былых заборчых паліцэйскіх манархіяў, дык увядзеньне шляхам дэкрэту да гэтага-ж заканадаўства яшчэ **дадатковай кары** за „праступленьні прэсы“ прыме выгляд асабліва пікантны. Можна сказаць—на пацяшэньне паном пэпээсам, што гэтая дадаткавая кара за „грахі палітычнай і грамадзкай мысьлі“ ў Польшчы—адна з праяваў „рэвалюцыйных пасьледзтваў“ маёвай „рэвалюцыі“, якую рабілі—побач з іншымі—і паны Пэпээсы...

Да караў, прадбачаных іншымі законамі, дэкрэт дадае яшчэ штрафы ад 1000 да 5000 злотых, а апрача таго і — канфіскаты...

Цікаўнай навіной зьяўляецца азначэньне паняцьця „канфіскаты“. Канфіскуючы друк, улада мае права ня толькі зьніштожыць друкаванае на паперы, але „зьніштожыць“ і тыя прылады, формы і пліты, якія служылі для адбіцьця друку...

Апрача асабістай кары, штрафу і канфіскаты, дэкрэт дае права суду—змусіць часопісь да бясплатнага надрукаваньня ў ёй прысуду суда; у выпадках „асаблівай вагі“ суд можа прыпыніць выдавецтва на 3 гады.

Апрача гэтых агульных правоў улады, дэкрэт падрабязна вылічае цэлы рад спэцыяльных праступленьняў прэсы, не даючы аднак-жа іх сыстэматычнага агляду.

Забарона, як усюды на сьвеце, пашырэньне вестак аб вайсковых сакрэтах дзяржавы — са шкодай для інтарэсаў апошняй. За гэта пагражае кара да году вастрогу і 3000 штрафу. У часе вайны кара ўзрастае ў 2—3 разы.

За апублікаваньне даных судовага сьледзтва—да расправы на судзе — кара да 3 х мес і 1000 злот. Тыя-ж кары—за справаздачу з судовай расправы, адбытай пры зачыненых дзьверах.

Тое-ж—за апублікаваньне наагул тайных дзяржаўных актаў. Апошні артыкул можа тлумачыцца вельмі самавольна.

Яшчэ больш небясьпечны нова-ўведзены ў заканадаўства артыкул, які пагражае значнай карай за фальшывую справаздачу аб судовым працэсе „ў часе няскончанай расправы“—з мэтай націску на суд або—на публічную апінію“... На падставе гэтага артыкулу можна пацягнуць да адказнасьці за кожную справаздачу з бягучага працэсу, напісаную навет вельмі спрытным старым рэфэрэнтам.

Забаронены ня толькі „выражэньні пашаны і прызнаньня“ засуджанаму судом „праступніку“ прэсы, але навет зьбіраньне складак дзеля заплаты судовых коштаў ды прысуджанага судом штрафу, што заўсёды і ўсюды робіцца—навет тут-жа ў судзе...

Асабліва цяжкія кары прадбачаны дэкрэтам за „нарушэньне асабістай чэсьці“ ў друку. Тут суд можа прысудзіць—ня толькі адшкадаваньні за страты, але яшчэ — у дадатак—„здаваленьне за маральную крыўду“—да 10.000 злотых... Цікаўна, што тут суд можа адкінуць усе довады праўды, добрай веры ці праўдападобнасьці—у выпадках, калі справа датычыць асабістага жыцьця ці сямейных стасункаў пакрыўджанай асобы.

Новай зьяўляецца тутака „англійская

ўвесь урад салідарна"... Усе папярэднія „ўхвалы" (пастановы) ППС — або выключалі з лічбы адказных за ўсё гэта прадстаўнікоў ураду канстытуцыйна адказнага прэм'ера, марш. Пілсудскага, або папросту — маўчалі аб яго адказнасьці, якая пэўна-ж павінна была неяк лучыцца з тэй „паўнатой улады", якую ўзяў у свае рукі марш. Пілсудскі... Дык вось—за ўсё гэта, а ў дадатак—за тое, што ўрад (марш. Пілсудскага) не зрабіў дагэтуль ніякіх крокаў дзеля разьвязаньня справы нацыянальных меншасьцяў, асабліва—за тое, што ён „адказаў упорным маўчаньнем на ўсе ўхвалы і трэбаваньні сьняжнёвай сэсіі Рады", якая дамагалася радыкальнай зьмены буйна-буржуазнай і абшарніцкай палітыкі ўраду,—**Галоўная Рада пастанавіла перайсьці адносна да ўсяго ўраду (марш. Пілсудскага) ў апазіцыю**"...

Асобную рэзалюцыю прыняла Рада ў справе „палітычных перасьледаваньняў з боку ўраду — з тасаваньнем **сыстэмы правакацыі**,—якія дэмаралізуюць і раскладаюць публічнае (грамадзкае) жыцьцё ў краі. Справа Ваявудзкага, ліквідацыя Беларускай Грамады, цэлы рад судовых працэсаў у „крэсавых" ваяводзтвах—раскрываюць увесь зьмест гэтай раскладаючай сыстэмы".

Пэпэесаўская Рада абяцуе рашучую барацьбу з гэтай сыстэмай.—Пабачым!

Рада, апрача таго, зацьвярдзіла пастанову Ц. К.—аб байкоце выбараў у мястовыя самаўрады ў Галічыне, калі яны будуць рабіцца паводле старой рэакцыйнай аўстрыяцкай „ордынацыі" 1868 г...

ХРОНІКА.

Паход проці Бел. Каап. Банку. Дзеля характэрыстыкі адносінаў улады да Беларускага Каапэрат. Банку, падаем тэкст цікаўнага дакумэнту, прысланага Банку з Пінску:

„Беларускі Каапэратыўны Банк у Вільні. Таварыства з агранічанай адказнасьцю Пінскі Аддзел. Дня 2 чэрвеня 1927 г. У Беларускі Каапэратыўны Банк у Вільні. Гэтым Пінскі Аддзел паведамляе, што 1 га чэрвеня г. г. сябра **Банку Марка Саўчанчык з вёскі Завідчыцы, Хоінскай вол. заявіў, што Хоінскі камандант паліцыі Сенкевіч некалькі разоў прымушаў яго выпісацца з ліку сяброў Белар. Банку, пагражаючы трохмесячнай адседкай у турме**, аб чым сягоньня за № 160 паведамлены Пінскі Камандант Паліцыі. Беларускі Каапэратыўны Банк у Вільні Тав. з агран. адказн. Пінскі Аддзел—Антановіч".

Літвіны на выбарах у мястовую раду ў Вільні. Літоўскае грамадзянства м. Вільні, пасьля таго, як група Ярэміча „здрадзіла" сваіх фашыстаўскіх прыяцеляў і злучылася з расейцамі, — пастанавіла йсьці на выбары самастойна, бо з радыкальнымі беларускімі групамі яму не па дарозе. Дзеля гэтага **ўтварыўся асобны літоўскі выбарны камітэт**, які вядзе энэргічную працу. І зусім слушна: бо ў Вільні мусяць мець голас у самаўрадзе ўсе нацыянальнасьці краю, у тым ліку і літвіны.

Нішчэньне лясоў. „Rzeczpospolita" зварачае ўвагу на сыстэматычнае нішчэньне нашых лясоў. На ўсю Польшчу лясоў прыпадае 9 мільёнаў гэктараў (гэктар—каля дзесяціны). Гадавы прырост дрэўнае масы—каля $21^{1}/_{2}$ мільёна кубічных мэтраў. І гэта—найвялікшая колькасьць, якую можна высячы ў працягу году, ня нішчачы лесу. Аднак, у Польшчы (пераважна на прасторах Заходняй Беларусі!) сякуць лясы, не аглядаючыся на такую „драбніцу": абы грошы спагнаць, —а што будзе далей, гэта сучасных паноў палажэньня ня цікавіць. Ведама, найбольш рабункова гаспадарка вядзецца у лясох прыватных асоб—абшарнікаў. Гэкак у леташнім годзе высеклі лесу аж 31 мільён. куб. мэтраў, ці—інакш—лесу зьнішчана беспаваротна аж $9^{1}/_{2}$ мільёна куб. мэтраў! Гэта ўжо не адрасьце...

Вось, як „гаспадаруюць" паны-абшарнікі нацыянальным дабром!

Замах на цягнік пад Бенянонямі. 31-га траўня каля ст. Беняконі, Лідзкага пав. перад праходам цягніка сторож знайшоў на рэльсах паложаныя ў 5 мясцох шпалы. Гэтак удалося не дапусьціць да разьбіцьця поезду. Паліцыя занялася шуканьнем вінаватцаў.

Лекцыі ў Т ве Беларускае Школы. Чытаныя сыстэматычна ў працягу мінулае зімы і вясны лекцыі ў Т-ве Бел. Школы на летнія месяцы прыпынены. За лета будзе распрацаваны плян лекцыяў на далейшы час, пачынаючы ад восені.

Гэтак сама на восень пераносіцца і вельмі цікаўная лекцыя мастака Сергеевіча аб беларускім мастацтве. Лекцыя была вызначана на гэту суботу, але лектар з незалежных ад яго прычын мусіў яе адлажыць на пазьнейшы час.

Вечар сьмеху". У суботу, 4 га чэрвеня у салі Народнага Дому Т-ва Беларускае Школы адбыўся спэктакль, на якім былі прадстаўлены: **„Пакой у наймы"**, аднаактовы жарт А. Паплаўскага і А. Галянскага і **„Мікітаў лапаць"**, камэдыя ў 2-х актах М. Кудзелькі. Вечар закончыўся танцамі, якія працягнуліся да 3 гадзіны ночы.

На вечары публіка запраўды даволі сьмяялася, як-бы сілком адарваўшыся ад заўсёднага прыгнечанага стану. П'ескі давалі для гэтага не благі матар'ял.

Што да выкананьня—магло быць і лепшае. Заўважыўся характар імпровізаванасьці пастаноўкі, слабае апрацаваньне роляў. Але і пры такім палажэньні арганізатары заслугоўваюць на пашану, як працаўнікі, жадаючыя паставіць справу тэатру ў Вільні на сталы грунт. У гэтым адношаньні трэба выказаць падзяку грамадзянам: М. Сіняўскаму і Замэцкаму, якія, відаць, папрацавалі вельмі шмат, каб з тэхнічнага боку пастаноўка рабіла неблагое ўражаньне. Толькі-што адбудаваная сцэна ў Народным Доме, пры невялікім разьмеры, кідалася ў вочы даволі добрай і суадказнай дэкарацыяй, артысты падобраны з задаткамі добрых мастацкіх здольнасьцяў. Ня гледзячы на малую падгатоўку, шмат хто з іх выканаў свое ролі здавальняюча, а некаторыя паказалі сябе, як мастакі, з найлепшага боку.

Што да апошняга — трэба асабліва адзначыць гульню грам. Ст. Туркевічанкі, якая ў п'есе „Пакой у наймы" ролю служанкі і п'есе „Мікітаў лапаць" ролю Дар'і згуляла прост артыстычна. Грам. Маразовіч паказаў неабы якую здольнасьць да камічных роляў, як бы ствараючы новы тып Мікіты (ў апошняй п'есе). Грам. Э. Залкінд зусім добра выканала свае ролі ў абедзьвюх п'есах. Добра, як заўсёды, згулялі свае ролі маладая артыстка грам. Грыц і грам. Замэцкі. Няблага прайшла роля Яўменя ў апошняй п'есе (грам. М. Сіняўскі).

Заўважым тут, што тэатр найболей хворае месца ў агульнай грамадзкай працы на Вільні. Прыходзіцца вельмі шкадаваць, што людзі лічучыя сябе „кваліфікаванымі артыстамі", вельмі слабыя, як грамадзяне, і замест працы, здаюцца на тое, што хтосьці за імі „ухаживал"!

А сілы мастацкія ёсьць і неблагія. Патрэбна толькі добрыя арганізатарская рука і, галоўнае, малады запал да працы. Будзем спадзявацца, што стараньні Цэнтральнага Гуртка Т ва Бел. Школы не прападуць дарма і тэатр у Вільні хутка стане хаця-ж-бы на такой вышыні, як стаіць ужо хор грам. Шырмы і духавы аркестр грам. Карэтнікава.

Беларуская лекцыя ў Варшаве. 15-га траўня г. г. вечарам у памешканьні Украінскага Клубу ў Варшаве адбылася беларуская лекцыя. Лекцыя была прачытана беларусам-студэнтам М. Грыгаровічам у роднай беларускай мове на тэму: **„Беларускі народ у яго мінуўшчыне"**.

На лекцыю сабраліся: беларускія, украінскія, баўгарскія, сэрбскія, польскія і нямецкія студэнты, апрача іх, прышлі і працоўныя людзі ад гэтых і іншых народнасьцяў—усіх было лікам чалавек з 80.

Лекцыя зрабіла вельмі цікавае ўражаньне на слухачоў, што рэдка чулі жывую беларускую мову, і паказала беларускую самадзельнасьць з духовага, унутранага і вонкавага бакоў нашай пра-прадзедаўскай мінуўшчыны амаль да апошняга часу.

На канчатак запялі беларусы: „Ад веку мы спалі" і інш. белар. песьні, якія на прысутных зрабілі сваёю прыгожай мэлёдыяй захопнае ўражаньне і сваім зьместам паказалі, што народ наш жывець!

Такія ж беларускія лекцыі маюць адбывацца часьцей у будучыне—на роўні з украінскімі, баўгарскімі і др. дзеля пашырэньня веды аб жыцьці нашага народу і другіх братніх нам народаў.

Афіцыяльны курс грошы на 7 чэрвеня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

7./VI. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Паўлюкевічаўскія баламуцтвы.

Мы атрымалі экзэмпляр адозвы пад назовам: „Грамадзяне Беларусы! Шыкуйцеся да выбараў у самаўрады!"—з подпісам: „Цэнтральны Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт на Віленшчыну і Наваградчыну".

„Адозва", на пагляд, добрая: у ёй тлумачыцца, як будуць адбывацца выбары ў гмінныя самаўрады. Але, чытаючы далей, лёгка дагледзіць, што гэта за „Камітэт" і з якімі мэтамі яе выдае.

„Адозва" падае тыя **фармальныя падставы**, на якіх адміністрацыя можа „разьясьніць" і пазбавіць права быць выбраным у гмінную раду кожнага грамадзяніна. Гэта — згодна з § 11 выбарнага закону Асмалоўскага—ёсьць: калі пазбаўлены правоў ці агранічаны ў правох судовым прыгаворам, калі знаходзіцца пад **судовым** сьледзтвам, як западозраны ў праступку, за які па закону пагражае пазбаўленьне або агранічэньне правоў. Але „Адозва" пашырыла гэтыя фармальныя падставы, заяўляючы, што—па закону — пазбаўленым выбарнага права будзе кожын, аб кім ідзе сьледзтва (навет дазнаньне), не гаворачы нічога, што гэта датыча сьледзтва ці дазнаньня—толькі **судовага**, а не паліцэйскага, ці дэфэнзыўнага! Зрабіўшы гэткую нацяжку, „Адозва" ўжо зусім лёгка распраўляецца з усімі „неблаганадзёжнымі" з паліцэйскага пагляду асобамі (—а гэта-ж ёсьць усе сьвядомыя і актыўна працуючыя беларусы!) і заяўляе: „Усе праступныя элемэнты або **так ці інакш скампраметаваныя, а навет толькі падазроныя ў чымсьці — хай лепей ня рыпаюцца** і ня ідуць у сябры. Іх могуць толькі дарма змарнавацца галасы".

Тут ужо робіцца ясьней, што гэта за „Камітэт" і дзеля чаго выдае гэную „Адозву". А ўжо зусім ясна стане, калі прачытаем далей гэткі красамоўны заклік:

„Хай жа кожны забудзе ў мамэнт выбараў аб сваіх асабістых сымпатыях ці ворагах, аб асабістай нейкай партыйнасьці.

„Насамперш — далоў усякую палітыку! **У самаўрады павінны прыйсьці людзі працы, а ня гучных слоў і пекных лёзунгаў!**

„Не выбірайце палітыканаў, крыкуноў і шчодрых на абяцанкі! Здаецца, ужо пераканаліся, што чым больш хто абяцае, тым менш дае. **А да чаго даводзе „высокая" палітыка гучных абяцанак і пекных лёзунгаў—бачылі на прыкладзе Грамады".**

Вось-вось. Як ведама, у арганізацыі заўсёды йшлі і йдуць не „палітыканы і крыкуны" толькі, а ўсе сьвядомыя нацыянальна і сацыяльна грамадзяне. Гэтыя грамадзяне—найлепшыя працаўнікі ў самаўрадах і грамадзкіх установах, і навет самі палякі („Głos Prawdy") мусілі прызнаць, што „грамадаўскія" дзеячы павінны быць запрэжаны ў самаўрадавую працу, дык тады — „ня будуць бунтавацца". Але-ж аўтарам „Адозвы" і „Камітэту" йдзе якраз аб тое, каб гмінныя самаўрады" і надалей аставаліся „фальваркам пана старосты", каб там ня было сьвядомых, цьвёрдых і самастойных людзей, а сядзелі-бы адно толькі безгалосыя, пакорныя „вышэйшаму начальству" сяляне, з якімі можна зрабіць усё... Вось, дзеля якое мэты і стварыўся „Камітэт"! А калі-б каму йшчэ гэта паказалася не даволі пераконываючым, што роля „Камітэту"—сьвядома проціграмадзкая,—дык хай зьверне ўвагу на „прыпіску" да адозвы, дзе гаворыцца, што „раёнавыя камітэты на мясцох" будуць апублікаваны ... **павлюкевічаўскім „Беларускім Слове"!**

Вось хто стварыў гэны „Камітэт"! Вось хто выдае баламутныя і правакацыйныя „Адозвы"!

Як сялянства павінна аднясьціся да „Камітэту" і ягоных павучэньняў, хіба ня трэба і й казаць...

Колькі слоў да беларускіх выдавецтваў.

Як адзначала наша газэта, беларуская кніга цяпер з чынніка ідэёва-прапагандыстычнага ператварылася ў чыннік характару гандлёвага; кніга выдаецца для гандлю, заробку. У зьвязку з гэтым , поруч з Беларускім Выдавецкім Т-вам, паўсталі да жыцьця і пачалі разьвівацца некалькі іншых выдавецтваў.

Вось-жа тут мусім адзначыць адну рэч, можа быць навет чыста псыхолёгічнага характару. Раней кожная беларуская кніжка была, „божым дарам, якая, як сьвятыня, набывалася людзьмі і хавалася ў пепшых месцах бібліатэкі. Некалькі кніжак з любоўю перадавалася на захаваньне ў музэй. Цяпер — іншая рэч. З кнігамі робіцца па пагаворцы—„перахрысьціў ды пусьціў", і ў музэй Ів. Луцкевіча не паступае ніводнае кніжкі апроч выданьняў Белар. Выд. Т-ва ды прыватных культурнікаў. Нашым выдавецтвам усё-ж патрэбна зьвярнуць увагу і пры новым палажэньні рэчаў на справу захаваньня кніжак, бо ня трэба забывацца, што кніга астаецца і назаўсёды культурнаю цэннасьцяй, захаваньне якое важна ня толькі з ідэйнага боку, а хоць-бы навет і з пункту гледжаньня захаваньня іменьня таго-ж выдаўца для гісторыі.

Спадзяёмся, што нашы выдавецтвы паправяць гэтую занядбаласьць культурнага боку справы. Проста ў уласным інтарэсе кожнае беларускае выдавецтва павінна пасылаць усялякі свой друк у музэй. Няхай гэта напамінаньне паслужыць добрым пачынам у гэтай справе.

Культурнік.

сыстэма „маральнага адшкадаваньня" — у гатоўцы, як дадатак да іншых караў..

У далейшых артыкулах дэкрэт забараняе перадрукі сканфіскаваных ці „арыштаваных" („заентых"?) артыкулаў, а таксама выдаваньне прыпыненых часопісяў.

За нязгоднае з правіламі дэкрэту надрукаваньне запярэчаньня адказны рэдактар адказывае — па суду — арыштам і штрафам. Але ўжо нешта зусім нячуванае дагэтуль: кожны нумар газэты, які зьявіцца без вымаганага законам запярэчаньня, улада мае права канфіскаваць—хаця 100 разоў, пакуль нарэшце ня змусіць рэдактара да надрукаваньня запярэчаньня.

III частка дэкрэту пачынаецца артыкулам, які аддае прысуд за праступкі прэсы выключна ў рукі судовае ўлады. Першы „дэкрэт", як ведама, дзяліў гэтую рэгалію судовае ўлады з адміністрацыяй.

„Цікаўную" навіну ўводзіць дэкрэт для судовых справаў аб пакрыўджаньні чэсьці. Агульны прынцып кажа, што справу вырашае суд, які знаходзіцца ў месцы выкананьня праступку. Але Дэкрэт для справаў проці чэсьці робіць вынятак: можна падаць скаргу ў суд, які знаходзіцца ў месцы, дзе жыве пакрыўджаны. Гэткім чынам, напрыклад, віленскі рэдактар можа быць раптам паклікаты у суд у Пазнані, у Варшаве, ці ў Кракаве... Шмат, відаць, можа здарыцца падарожаў п. п. рэдактаром пасьля Дэкрэту!

Адміністрацыйная ўлада, апрача суду ці пракурора, можа—замест „канфіскаты",—зрабіць „арышт" (заеньце") друку. Праўда, гэтае „заеньце" павінна быць зацьверджана судом у працягу 3 дзён, але мэта ўлады ўсё ж і гэтымі трыма днямі прыпыненьня часопісі будзе дасягнута...

У Польшчы істнуе так-званы „карны загад". Гэта — „скарочаны" судовы працэс замест даўгога і дакладнага разгляду — у выпадках, калі пагражае за праступак „дробная" кара: 14 дзён арышту — з адпаведным таксама „дробным" штрафам. Гэта тады, калі довады віны „не выклікаюць сумліву".... Тады судзьдзя выдае папросту—„карны загад" і—канец. Гэткі скарочаны суд тасуецца тады, калі, напрыклад, выпусьціць сабаку на вуліцу бяз нумару ды намордніка, ці калі дамаўласьнік не асьветліць усходаў. Дык вось, Дэкрэт тасуе гэты прынцып „скарочанага суду" і да „праступнікаў прэсы".—Акружны суд, ці міравы судзьдзя могуць **навет не выклікаючы абвінавачанага рэдактара ў суд, заочна засудзіць яго аж да 3 месяцаў вастрогу, 100 зл. штрафу і — сканфіскаваць друк...** — Драбніца! Гэта значыць, што звычайнаму грамадзяніну пры выкананьні яго прафэсіянальнага абавязку, можа—у „парадку скарочанага суда" — пагражаць толькі 14 дзён арышту, а рэдактары маюць „прывілей"—аж на 90 дзён... Праўда, асуджаны можа ў 3 дні падаць пратэст—**у той-жа суд!**

Важнай і добрай навіной зьяўляецца дамаганьне, каб суд—чым хутчэй—не пазьней, як у 14 дзён,—рабіў расправу ў-ва ўсіх прэсавых справах. Але, на-жаль, толькі ўмоўна: калі „дазволіць на гэта стан справы"...

Зусім „дзіўным", каб не сказаць мацней, зьяўляецца права, дадзенае Дэкрэтам міністру справядлівасьці — выбраць спаміж судзьдзяў сталага... **спэцыяліста ў прэсавых справах**, якому і будзе даручаны разгляд усіх спраў прэсы... Праўда, гэта датычыць толькі справаў, якія будуць разглядацца ў міравых судох. Але ж ведама, што гэты „спэцыяліст" будзе ўжо — як мае быць... Тое ж самае аднак жа датычыць і судоў акружных, толькі там міністар выбяра „тройку" судзьдзяў, якіх на працяг 3 гадоў назначыць „спэцыялістамі ў справах прэсы", ды якія маюць так „навастрыцца", каб суд быў перадусім „хуткі"...

„Веснаход".

У мінулую нядзелю 29-га траўня ініцыятыўнай групай пастаноўлена арганізаваць Т-ва маладых беларускіх пісьменьнікаў і мастакоў Зах. Беларусі пад назовам „Веснаход — з сядзібай у Вільні. Ухвалены статут Т-ва, які падаецца для зацьверджаньня ўладам. Т-ва будзе арганізацыяй строга апалітычнай і мець на мэце згуртаваньне маладых літэратурна-мастацкіх сілаў Зах. Беларусі для больш прадукцыйнай працы над разьвіцьцём беларускае літэратуры і мастацтва, як таксама і над самаразьвіцьцём праз сыстэматычнае студыяваньне беларускай і сусьветнай літэратуры і мастацтва з боку формы і зьместу, чытаньне рэфэратаў, ладжаньне мастацкіх вечароў, вызначэньне конкурсаў і г. д.

Для правядзеньня ў жыцьцё пастаноў выбраны часовы прэзыдыум у гэткім складзе: Старшыня паэтка Натальля Арсеньнева, пісар — мастак М. Васілеўскі, вольны сябра павясьцяр — У. Грыневіч. Запрошаны для працы ў прэзыдмуме на правох ганаровага сябры паэт А. Бартуль.

Прэзыдыуму пастаўлена ў абавязак, поруч з працай па зацьверджаньню статуту, пачаць папярэднюю рэгістрацыю сяброў і наладжаньню будучай працы.

Зараз-жа пасьля паседжаньня было зарэгістравана 15 асоб, якія пажадалі прыняць удзел у працы Т-ва, выгалошаны тры конкурсы: гімн „Веснаходу", гэрб і вокладку для будучага альманаху, які мае паказацца неўзабаве. Намечана для распрацоўкі некалькі рэфэратаў.

Усіх заінтэрасаваных прэзыдыум просіць зьвяртацца па адрасу: Вільня, Віленская 12—6, Т-ва „Веснаход".

Маладыя сябры! Каб стварыць нешта лепшае—трэба вучыцца, а навучыцца лепей разам, адзін аднаму памагаючы. Т-ва заклікае да працы ўсіх жадаючых у Вільні і на правінцыі.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

ПАЛЯГЧЭЛА...

...Тыя пісьмы з вёскі, якія мы адтрымліваем штодня ад сялян — пісьмы, у якіх з кожнага слова б'ець здаровым розумам народным. зьяўляецца для нас больш аўтарытэтным судзьдзёю, чымсь хітрая палітыка пісак з „Нашае Праўды". А гэтыя пісьмы якраз і кажуць, што наша часопісь выбрала верны шлях і народ наш на гэтым шляху нас падтрымаець.

(„Беларускі Дзень" 22.V. с. г. № 12).

Пан рэдактар „Беларускага Дня" нэрвова хадзіў і хадзіў па рэдакцыйным пакоі. А ля стала сядзеў Язэп, зяваў, ікаў і плюваў проста на падлогу.

Рэдактар яшчэ шыбчэй забегаў сваімі маленькімі ножкамі.

— Ды перастаньце вы нэрвавацца далібог!—азваўся Язэп. Проста чалавека з цярплівасьці выводзіце...

— Паночку, не перашкаджайце, а то я вас са сьпісу вычыркну! Самі вы нічога ня робіце і другім думаць мяшаеце.

— Ну што там думаць, чаго думаць?—усё роўна нічога ня выдумаеце.

— Як ня выдумаеце?!—Вам, дармаеду, лёгка гэта казаць, а мне аж галава на часткі трэскаецца. Вун „успаміны з Пэрсыі" канчаюцца, аб чым я тагды пісаць буду?

— Напішуць, бяз вас напішуць!

— Але што напішуць, паночку? Трэба напісаць нешта такое, каб як найбольш перацягнуць беларусаў на нашу старану, бо там (шапнуў сэкрэтна на вуха) мне казалі, што калі мы ня згрупуем больш прыхільнікаў каля сябе, дык.. крэдыт зачыняць.

— Не зачыняць! Я там — буду. Я з імі пагавару,—я з імі ўмею гаварыць!

— Паночку, лепш не хадзеце і не гаварэце, а то ўсю справу расстроіце.

— Як расстроіце! Ды што вы панімаеце, далібог?—злаваўся Язэп. Якіх ім больш прыхільнікаў трэба? Гэта-ж ніводная беларуская

партыя, ці арганізацыя не рэкрутуецца са стальніх слаўных людзей, як наша. Пад нашым сьцягам супрацоўнічае ўся партыя эсэраў і былыя валэйшаўцы, і былыя камуністы, і былыя сельсаюзьнікі, — дык чаго-ж ім больш трэба?!

— Але ўсе гэта, паночку, былыя людзі— перакульшчыкі і грош ім цана. Памятаеце ў мэморыяле мы пісалі, што ўсю „Грамаду" да сябе перацягнем, а грамадзіста ў нас ніводнага й няма. Вось цяпер і падтыкаюць мне гэтым мэморыялам пад нос.

— Скажэце ім, што мала грошы даюць на гэта.

— Ня мала, паночку, ня мала! Жарты! Я ў акцызе за паўгода столькі ня браў, сколькі тут за месяц.

— Ага! прызналіся нарэшце: вы адзін грашмі абжыраецеся, а падуладная вам партыя эсэраў галадае.

— Паночку! дайце спакой з сваей партыяй. Адзін вы толькі чалавек у сваей партыі дый і той нічога ня робіць.

— А гэта што яшчэ за навіна?! Што я вам парабак які? Наагул мы эсэры нічога ня робім...

— А за што вы, паночку, ад нас адтрымліваеце?

— Як за што?! А за аўтарытэт!..

— Дайце спакой, паночку, з сваім аўтарытэтам!—проста стыдна.

— Усё зроблена і перагледжана. Ці матэрыялу больш няма?—заявіў увайшоўшы Макар.

— Няма, паночку, няма. Можа вы, Макар, што напішаце?

— Ня маю я чаго пісаць.

— Напішыце што колечы пра „Грамаду".

— Збрыдла ўжо мне гэта. Польскія газэты цяпер пра „Грамаду" маўчаць. Нашто нам забягаць наперад?

— Ну дык пра Антона...

— А што-ж пра Антона...

— Напішыце, што толькі выдумаеце.

— Калі іншыя газэты столькі навыдумлялі, што больш нічога ня выдумаеш.

— Які вы, Макар, недагадлівы! — напішэце, што толькі выдумаеце: папера ўсё сьцерпіць...

— Але што?

— А вось, паночку, напішэце, прыкладам, што Антон забіў бацьку, зьеў матку, прадаў дзяцей, спаліў 200 вёсак, скінуў цара-бацюшку, наслаў бальшавікоў на Расею і гэт. дал. Ці-ж мала чаго можна выдумаць?! А я вам, паночку, за кожны радок па злотаму заплачу.

— Ня люблю я пісаць на заданую тэму,– агрызнуўся Макар. Папрасіце пасла Рагулю, дык той, што толькі яму прыкажуць, напіша.

Пан рэдактар зноў пачаў нэрвовымі крокамі мерыць падлогу.

Язэп і Макар скрыліся ў суседнім пакоі.

— Прапаў я і акцыза мая! — роспачна думаў пра сябе рэдактар. Што маю рабіць, што маю рабіць?! З былых людзей мне карысьці мала, — стыдна навет мне з імі перад маімі панамі паказвацца. Ой, чую я, што закрыюць мне „авансік" за працу. Ну і што я зраблю бедны?—Удалося за грошы купіць толькі быўшых людзей, ды пару галодных студэнтаў, а больш, хоць ты трэсьні нікога не ўдаецца... Хоць-бы сяляне пісьмаў больш з вёсак прысылалі. Тагды б я мог пісьмамі перад маімі хлебадаўцамі-панамі апраўдацца, а то ўсяго жменька пісьмаў, на пальцах аднэй рукі палічыць можна і то ў іх больш лаянкі, як карысьці. Зазваніў званок. Паштальён падаў праз дзьверы адзін ліст.

— Нарэшце! слава табе, Божа, хоць адзін ліст...

Пан рэдактар дрыжачымі рукамі адчыніў канвэрт і прагавіта аддаўся чытаньню. Аднак хутка зьмяніўся: перш пачырванеў, пасьля пабялеў, а пасьля пазелянеў і нярухома, як сноп, зваліўся на канапу. Каля яго, на падлозе ляжаў толькі што атрыманы ліст.

У лісьце было напісана: ...„не прысылайце мне больш сваей паскуднай газэціны, бо яна ня варта таго, каб яе працоўны селянін чытаў, а навет у рукі браў. Цяпер у кожнага працоўнага вочы адчыніліся і здраднікаў сваіх яны нюхам чуюць. Хоць вы і прыкідваецеся абаронцамі беларускага народу, але мейсца вам на сьметніку, а ня ў рэдакцыі. Калі вы за юдавы грошы выпускаеце сваю газэту, каб сабе добрыя пэнсіі браць, дык самі выпускайце і чытайце, а нам не прысылайце. Калі не перастанеце высылаць мне сваей бруднай газэціны, дык прыеду да Вільні і распраўлюся з вамі так, як мне ўздумаецца"...

Пан рэдактар ляжаў самлеўшы на канапе, а з суседняга пакою данасілася: — Разумееш ты, Макар, у яе ножкі,—ну, проста вытачаныя ножкі...

А Макар у нейкім захопленьні дэклямаваў:

„*Когда я был торэадорэм*"...

Тарас з Парнасу.

Карэспандэнцыі.

Вёска ідзе к сьвятлу.

(Крывіцкая гміна, Вялейскага павету).

Вельмі вялікая радасьць агортвае, калі бачым, што вёска шчыра бярэцца за культурна асьветную працу, што вёска ўсімі сіламі стараецца скінуць з сябе ярмо цемры і ўгледзіць сьвет.

Вельмі вялікая радасьць была для мяне, калі я даведаўся, што ў вёсцы Каранішачах будзе пастаўлены спэктакль, я проста ад радасьці аж падскочыў, што ў гэткай цёмнай вёсцы будзяцца ад сну людзі. А яшчэ больш ахапіла мяне радасьць, калі я ўвідзеў, што 22 траўня с. г. спэктакль, зладжаны Каранішацкім Гуртком Т-ва Бел. Школы ў вёсцы Каранішчах, вышаў вельмі добра, проста пamастацку. Згуляна была п'еса „Ня розумам сьціміў, а сэрцам". Многія шкадавалі, што не пашлі на спэктакль і казалі, што як будзе другі раз пастаўлены, то трэба ісьці. І ведама трэба, бо на спэктаклі можна ўбачыць многа чаго добрага, трэба ведаць, што спэктакль ёсьць адзін з шляхоў к сьвету і што пара нам, браты сярмяжнікі, стаць на роўні з іншымі культурнымі народамі.

Шчырая падзяка Вам артысты, — барацьбіты з цемрай! **Гр.**

Адабралі мэтрыку.

(Радашковічы, Беларуская Гімназія).

Дня 29.I 1927 г. вуч. V й кл. Радашкоўскай гім. Павал Асіповіч, прыехаўшы з калядных вакацыяў, пашоў замальдавацца ў тутэйшы пастарунак. Пастарунковы № 355, які замальдовываў, адняў, зусім не паказаўшы ніякай прычыны, у П. Асіповіча мэтрыку ўраджэньня, сказаўшы толькі: „niech pan przyjdzie jutro o godzinie ósmej, to w ten czas pan otrzyma metrykę". Але ўсё гэта быў абман, бо Асіповіч ужо ня раз хадзіў, а мэтрыкі не вярнулі. Якая прычына, не вядома і цяпер. Толькі ў астатні раз камандант гэтага пастарунку сказаў, „metryki nie zwrócim, — z tym jeśt wielka sprawa" Але не сказаў якая.

Справа гэта „wielka", а мэтрыка яшчэ ў пастарунку. Калі вернуць, невядома? Скарэй што на сьвятое ніколі.

Вось, чаго наш вучань не пераживе, чаго не пабача. Але ўсяго... ўсяго...

Ат—Ал.

За цэнзуроўку лістоў.

(Пошта Беніца, пав. Маладэчанскага).

Як была карэспандэнцыя ў „Нашай Справе", што на гэтай пошце цэнзуруюць лісты лісты сланыя да бел. установ, не аддаюць бел. газэт, а выклеіваюць сталы і сьцены, як у пошце, так і ў пастарунку. Усё гэта рабіла „парка лысых" кіраўнік пош. І. Кононовіч і камандант паст. К. Дзванкоўскі. За іхную „панюхачку" справа была перададзена пракурору. Даведаўшыся пра сваю небясьпеку, „парка" паабрывала ўсе газэты, як у пошце так і ў пастарунку. А ўсіх сялян, хто прыдзе на пошту, закідывалі „беларускімі" газэтамі „Бел. Словам" „Бел. Днём" „Biel. Krynica" і „Сялянскай Нівай", а навет „Белар. Доляй".

А нашай газэты „Нашай Праўды", то не даюць. Лісты цэнзуруюць, як і раней, бо выкрыўся факт, вынята з канвэрта 5 марак пaш. і праз абмылку, уложана другое пісьмо, што паказывае праўду.

Але нешта не паладзіла „парка", бо каманданта К. Дзванкоўскага перавялі ў другое мейсца, а сюды далі лепшага, бо праца пашла ўгару.

Дык вось, як зварачываюць увагу на нашыя просьбы і як караюць за наша дабро.

Атаман Ал.

Інстытут рассяваньня шапак.

(Радашкевічы, пав. Маладэчанскі).

У нашым мястэчку ёсьць так-званыя сельсаюзьнікі і хадэкі. Такіх хадэкаў і сельсаюзьнікаў ёсьць „шмат", аж 2-х Пяцюкевіч і яго прыхвасьцень Вольскі. Адчынілі бібліатэку-чытальню інбелкульту, якая складаецца з „дзюжыны" кніг, мала карысных для сялян. Журналаў ані гаспадарскіх, ані культурных няма, толькі „Biel. Krynica" і „Сял. Ніва", а часамі і „Бел. Дзень". А што газэт „Нашай Праўды" ды „Родных Гоняў" то са сьвечкай ня знойдзеш у бібліатэчцы. А калі дзе якая заблукаецца, то „парачка" канфіскуе (як было пярвей з „Nar. Zwonam).

Як яны кажуць: „гэтыя газэты немагчымы для нашай бібл.". Праўда што немагчымы, бо канфіскуеце.

Сяброў маюць ня болей як адну трэцьцюю, дзюжыны". І тыя адны п'яніцы. Бо ў іхны інстытут ніхто не хацеў запісывацца, то яго кіраўнікі давалі па бутэльцы водкі таму, хто запішыцца ў інстытут. Вось паясьненьне: прыхвасьцень Вольскі даў Ул. Я-віну бутэльку гарэлкі за тое, што запісаўся ў сябры.

Бібліатэка адчыняецца толькі перад „урачыстымі" днямі. Зьбяруцца якія кольвек дзеці, ды шалеюць, раскідаюць шапкі. І цяпер тут ходзіць погаласка „інстытут рассяваньня шапак — а ня культуры".

Дык вось, як шпарка „расьце" інстытут.

Збышка.

Узяў падрад.

(В. Купяцічы, Пінкавіцкай гм. Пінскага пав.).

Мы некалькі гадоў дабіваемся беларускай школы. Зрабілі ўсё, што ад нас трэбавалася. Але, пакуль-што, не даюць.

Чутно, што Пінкавіцкі каманд. паліцыі Казлоўскі ўзяў падрад ад старaства, — за ўсякую цану адчыніць у нашай вёсцы польскую школу.

Ці ўдасцца яму гэта, не вядома, бо мы пастанавілі дабіцца сваей роднай беларускай школы.

Гэта нічога, што кам. Казлоўскі ідзе процiў народу! **Купяціцкі.**

З Т-ва Бел. Школы.

Сьвяткаваньне 10-х угодкаў сьмерці М. Багдановіча.

28-га траўня с.г. з прычыны 10 ўгодкаў сьмерці беларускага паэта-мастака Максіма Багдановіча Горадзенскай Акружной Управай Т-ва Беларускае Школы быў зладжаны памінальны вечар у салі клюбу Акадэмікаў жыдоўскіх, на якім акрамя беларускага грамадзянства былі прадстаўнікі жыдоўскага і польскага. Дзеля таго, што гэтае сьвяткаваньне мела характар публічны, увaход для ўсіх быў свабодны і бясплатны. Ува ўступным слове сэкратар Акружной Управы Зьм. Кулакоўскі папрасіў прысутных ушанаваць памяць вялікага песьняра М. Багдановіча праз уставаньне, пасьля чаго старшыня Акружной Управы П. Сяўрук прачытаў рэфэрат аб жыцьці і творчасьці М. Багдановіча. Пасьля рэфэрату адзін з сяброў Т-ва Беларускае Школы прадэклямаў верш паэта. На гэтым сьвяткаваньне і закончылася пад нясьціхаючыя воплескі прысутных.

× **Спэктакль.** А 9 гадз. у тым самы клюбе ў Горадні драматычнай сэкцыі Горадзенскага Гуртка Т-ва Беларускае Школы быў зладжаны вечар-спэктакль; ставілі камэдыі „Модны Шляхцюк" і „Лекары і Лекі". Ня гледзячы на дрэнную пагоду і дождж, было надта многа народу, які наагул цікавіцца праявамі нашага культурнага жыцьця. Трэба адзначыць, што артысты выканалі свае ролі вельмі добра, а гэтым самым яны зацікаўліваюць публічнасьць на другі раз ушанаваць сваей прысутнасьцю беларускі спэктакль-вечарыну. Пасьля камэдыяў пад гукі духавага аркестру распачаліся скокі, якія цягнуліся да раніцы пакідаючы ў усіх прысутных самае мілае ўражаньне. Агульны расход на пастаноўку гэтага спэктакля вечарыны вынес 164 зл., а прыход 176 зл.; застаўшыся чысдаход у суме 12 зл. 50 гр. пайшоў на адкрыцьце бібліатэкі-чытальні пры Горадзенскім Гуртку.

Як не лятуцелі горадзенскія „вялікія" дзеячы і збанкрутаваныя беларускія палітыкі, каб гэты вечар спэктакль праваліўся і меў дэфіцыт, — лятуценьні іх засталіся лятуценьнямі.

Мастацкая сэкцыя.

Горадзенская Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы падае да агульнага ведама, што пры Акружной Управе з'арганізаваная застала **мастацкая сэкцыя**, якая прыймае ўсялякія работы, як маляваньне партрэтаў, дэкарацыяў, шыльдаў, плакатаў і г. д. Усе сябры Т-ва і паасобныя Гурткі, заінтэрэсаваныя ў гэтым, зьвяртайцеся: Горадня вуліца Парахавая 4—42.

Гор. Акр. Упр. Т-ва Бел. Школы.

Справаздача з культурна-асьветнае працы Азіраўскага гуртка Т-ва Беларускае Школы, Браслаўскага павету.

Гурток з'арганізаваўся ў пачатку 1927 гаду і налічвае 20 сяброў, з якіх 14 запраўдных і 6 памагаючых.

Гурток адчыніў бібл.-чытальню імені Алеся Гаруна і выпісвае наступныя газэты і журналы: „Наша Паўда", „Народны Звон", „Маланку", „Родныя Гоні", „Саха" і „Заранка".

Гуртком наладжаны вечарыны: у студзені ў вёсцы Углы, Едзькае воласьці гулялі: „Страхі жыцьця" і „Суд". У лютым ў Засьценку Перавалока згулялі „Страхі жыцьця" і „Суд". У красавіку ў в. Азіраўцах згулялі: „Гурток" і „Зьбянтэжаны Саўка". Чысты даход у суме 33 зл. 80 гр. пайшоў на бібліатэку-чытальню.

Разумеючы, што ладжаньнем спэктакляў найляпей можна пашырыць асьвету, Гурток і ў будучыне будзе старацца ставіць спэктаклі на абшары ўсяго Браслаўскага павету.

Управа Азіраўскага Гуртка Т-ва Белар. Школы.

21/V—27.

Падзяка.

Доўгалагоўскі Гурток Т-ва Бел. Школы гм. Беніцкай, пав. Маладэчанскага складае ад імені ўсіх сябраў г. Гуртка шчырую падзяку, гр. Пав. Асіповічу з фальв. Манюшчыцаў г. гм. за ахвяру 52-дзьвох кніг у мове бел. і іншых для бібліатэкі і чытальні пры гэтым Гуртку. Таксама дзякуем, за другія матэрыяльная падмогі для гэтае бібліатэкі.

Чэсьць Табе, працаўніку сярод нашага Сярмяжнага-Народу! Будзь прыкладам праўдзівы сыне загнанай Бацькаўшчыны, для другіх.

в/з Старшыня Гуртка **Я. Жойдзін.**

Кірэўнік бібл-чыт: **Даніла Макарэвіч.**

В. Доўгі-Лг. 10-V-27 г.

АБВЕШЧАНЬНЕ.

× Пасьведчаньне, выданае Галоўнаю Упраўаю Т-ва Беларускае Школы ад 10/XII 26 г. за № 1714 на імя **Палаўсюка Васіля**, як дачаснага кіраўніка Баранавіцкім г-м Т-ва ўневажняецца.

Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы.

Ці ёсьць золата у Зах. Беларусі?

Гэалягічны Інстытут у Варшаве распачаў працу над дасьледаваньнем пытаньня, ці запраўды на Палесьсі ў нас ёсьць золата?

У Варшаву адумыснай экспэдыцыяй прывезены пробы пяску з над ракі Марачанкі, у якім мае быць золата. Гэтыя пробы і будуць цяпер дасьледаваны. Работа працягнецца каля 6 тыдняў, і толькі тады будзе дадзены адказ на гэтае цікаўнае пытаньне. Маюць быць такжа зроблены дасьледы, каб выясьніць, ці — у выпадку выкрыцьця золата — колькасьць яго будзе пакрываць кошты дабываньня.

З Радавае Беларусі.

10-ыя ўгодкі сьмерці М. Багдановіча.

29.V адбыўся ў Менску ўрачысты сход Інстытуту Беларускае Культуры, прысьвечаны памяці М. Багдановіча. Былі зачытаны даклады праф. Замоціным і Пятуховічам. У канцэртным аддзяленьні хор вельмі добра выканаў „Завіруху" („У бубны дахаў вецер б'е"). Паэты чыталі творы, прысьвечаныя Багдановічу, дэклямавалі і яго вершы. Пасьля сходу была прыбіта мармуровая дошка на доме, дзе радзіўся Максім Багдановіч.

Першы том твораў М. Багдановіча павінен выйсьці гэтымі днямі.

Усячына.

Спальны аэраплян.

Адбыліся першыя пробныя палёты новага нямецкага аэрапляну „Омнібус Юнкэрс", які зьяўляецца адным з самых аграмадных аэраплянаў у сьвеце.

Гэты самалёт мае кабіну на 25 пасажыраў і абслугоўваецца камандай з чатырох чалавек. Корпус самалёта мае ў шырыню каля 3 мэтраў. Пасажырская кабіна мае 20 спальных месц, разьбітых на 3 аддзяленьні: для курачых, някурачых і жаночую каюту.

Апрача пасажырскай кабіны, самалёт мае памешканьне для багажа і падсобнае машыннае аддзяленьне для спэцыяльнага матора, працуючага на асьвятленьне, радыё і гэтак далей.

Нікеліраваны шрыфт.

Супроцоўнік, Маскоўскага дзяржаўнага інстытуту аховы працы Блінаў дзеля аздараўленьня друкарскай прамысловасьці ад сьвінцовага пылу запрапанаваў увясьці ў друкарнях нікеліраваны шрыфт. Літары, пакрытыя нікелем, робяцца больш цьвёрдымі, доўга ня сьціраюцца і даюць больш выразны друк.

Пры ручным спосабе нікеліроўка складае ад 75 да 100 проц. кошту самага шрыфту, а трываласьць нікеліраванага шрыфту перавышае ў 12—15 разоў трываласьць звычайнага. Такім чынам, нікеліроўка ўсё ж застанецца выгаднай. У далейшым дзяржаўны інстытут аховы працы маецца мэханізаваць нікеліроўку і тым самым зрабіць яе больш таннай.

Ужываньне нікеліраванага шрыфту дасьць магчымасьць зрабіць друкарскую працу з санітарнага боку зусім нешкадлівым.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.